# Самапомач Самаромах

Беларуская Кооператыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год IV. | Вільня, Жнівень 1935 г. | № 8.

*Хай злыдні над намі,*
*скрыгочуць зубамі*
*Любі сваю ніву, свой*
*край,*
*І, колькі ёсьць с·лы,*
*да самай магілы*
*Ары, барануй,*
*засявай!..*

ЯНКА КУПАЛА.



*Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу.*

Джордж РЭССЭЛЬ (Ірляндзец).



## ЗЬМЕСТ №8 (37).



# Ceny ŭ Vilni

*2.VIII.35. Ceny za 100 kilohram.*

**Zbožža.**

**(Pry kupli—prodažy).**

| | |
|---|---|
| Pšanica | 17.50 |
| Muka pšaničnaja | 19.10—29 25 |
| Muka, žytniaja da 55% | 22.50 |

*(Ceny z papiarednich dzion)*

| | |
|---|---|
| Žyta | 11.00 -12 00 |
| Avios | 13.00 —14,45 |
| Pšanica | — |
| Muka pšaničnaja | 13.00 -19 00 |
| Muka žytniaja da 55% | 22.50—23 00 |
| Muka žytniaja da 65% | 19.00—19 50 |
| Muka žytniaja sitkovaja | 14 00—15 00 |
| Muka žytniaja razovaja | 14 50—15 00 |
| Muka žyt. da 82% (typ vajskovy) | 16 00 |

| | |
|---|---|
| Makuchi lannyja | 17.00 |
| „ soniečnikavyja | 17 00 |
| „ repakavyja | 13.00 |
| „ kanaplanyja | 11.00 |

**Małočnaje za 1 kilo (31.VII.35.).**

| | |
|---|---|
| Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie | 2.20—2.30 |
| „ „ „ „ „ u detalu | 2.60 |
| Masła stałovaje (II hat.) za kilo ŭ hurcie | 2.05 - 2.15 |
| „ „ „ „ „ u detalu | 2.40 |
| Syr ementalski (švajc.) za kilo ŭ hurcie | 2.80—2.90 |
| „ „ „ „ „ u detalu | 3 50 |
| Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie | 1.45—2 10 |
| „ „ „ „ u detalu | 1.60—2.60 |
| Jajki, kapa | 3.60—4.50 |
| „ štuka | 7—8½ hraš. |

# Ceny na pravincyi

*(Za 100 kilo, ad 15 da 30.7.35).*

**U Brasłavie:**

| | |
|---|---|
| Žyta | 7.70— 8.20 |
| Pšanica | 9.00—10.00 |
| Jačmień | 9.00— 9.50 |
| Avios | 8.00 – 8.50 |
| Bulba | 4.20— 4 80 |
| Siena | 3.50 – 4.00 |
| Kaniušyna | 3.80— 4 20 |
| Švini (za kilo žyv. vahi) | 0 50— 0.55 |
| Masła za kilo | 1.20— 1.50 |
| Jajko za štuku | 3—3½ hr. |

**U Maładečnie:**

| | |
|---|---|
| Žyta | 9.00— 9.30 |
| Jačmień | 9 50—10 00 |
| Avios | 9 50 - .0.20 |
| Bulba | 6.00— 7.00 |
| Siena | 4.00 – 5.00 |
| Švini (za kilo žyv. vahi) | 0 45— 0 50 |
| Masła za kilo | 1.60— 2 00 |
| Jajki, za štuku | 4—5 hr. |

*(Praciah bladzi na 3-ciaj bačynie vokładki)*

# Samapomač

BIEŁARUSKI KOOPERATYŬNA - HASPADARSKI ČASAPIS.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 9—4.

# Самапомач

| Hod IV. | Vilnia, Žnivień 1935 h. | Nr. 8 (37). |
|---|---|---|


## *Kooperatyŭna-haspadarskija naviny.*

**Ci dačakajemsia zvarotu?** — Na adbytym sioleta ŭsiesajuznym źjeździe polskaha sajuzu spažyv. kooperatyvaŭ „Społem" u Varšavie, vyjaśniłasia, što sajuz za hod mieŭ čystaj nadvyžki 52.900 zł.

Heta nadvyžka, peŭna-ž, sama saboj nia vyrasła. Na jaje złažylisia „abryŭki" z tych kooperatyveŭ, jakija choćki-niachoćki siahońnia da „Społemu" musiać naležać. Da hetaha sajuzu naležać, jak viedama, i kooperatyvy biełaruskija, jakija da siahońnia nia majuć svajho sobskaha sajuzu, jak heta majuć u Polščy: palaki, ukraincy, niemcy i žydy.

Polskija kooperatyvy, što naležać da „Społemu", ad svaich układaŭ dastajuć zvarot, kali nia ŭ formie hrašovaj ci tavarovaj, dyk u formie roznych pramysłovych ustanoŭ (fabryk, młynoŭ), jakija *pierarablajuć ichny-ž syrec i dajuć zarabotak miascovym ludziam.* Na biełaruskich abšarach „Społem" zahnieździŭsia ŭžo bolš jak 10 hadoŭ i dahetul niejak nia čuvać, kab źbiraŭsia budavać tut niejkaje padobnaje pradpryjemstva. Usia haspadarčaja palityka polskaha „Społemu" na biełaruskich ziemlach niejak nadta napaminaje kolonijalny vyzysk: nasadžvaje i ŭtrymlivaje svaje placoŭki na čužym nacyjanalna abšary na toje, kab tolki stul vypampovyvać hroš i ničoha nia robić na toje, kab pamahčy hety hroš utrymać; ab „napampoŭvańni" i havaryć niama što. Nia budziem hałasłoŭnymi. Na polskich abšarach „Społem" pabudavaŭ i ŭtrymoŭvaje vializarnyja fabryki: u Kielcach — fabryka myła, pasty i h. d., u Włocławku — fabryka cukierkaŭ, u Sokołovie Podlaskim — młyn i h. d. Pa hałovach społemaŭskich dziejačoŭ łunaje dumka pabudavańnia sobskaj cukroŭni, jakaja taksama nia stanie na abšary biełaruskim.

A što i kali nam?

Pradstaŭniki biełaruskich kooperatyvaŭ na akružnych konferencyjach pavinny damahacca, kab investycyjny plan sajuzu pryniaŭ pad uvahu i abšary biełaruskija. — U kooperacyi abaviazvaje prava zvarotu, a nie kolonijalnaha vyzysku.

**Uhodki P. Prakapoviča (29. VI. 1775 — 22.III.1850).** Ukrainskija, a za imi i pčalary ŭsiaho śvietu sioleta abchodziać 160-yja ŭhodki naradzinaŭ i 85-yja ŭhodki śmierci hienijalnaha ukrainskaha pčalara P. Prakapoviča. Z imiem jubilata źviazany vynachad: 1. 1-ha ŭ śviecie składanaha vulla; 2. dzieraŭlanaj kratki; 3. pieršaje planovaje raźviadzieńnie miadadajnych raślin; 4. ustanaŭleńnie, što ŭ vuloŭni razam nia možna ŭstaŭlać bolš 120—150 vulloŭ pčoł; 5. ustanaŭleńnie płoščy hniazdovaj ramki na 1.300 kv. cm. i mnoha mnoha inšych vynachadaŭ i spaściarohaŭ. — Radziŭsia i pamior Prakapovič u Čarnihaŭščynie, u s. Myčenki, Kanatopskaha pav. Umirajučy pakinuŭ pasieku, u jakoj było da 10.000 vulloŭ. — Sučasnyja ukrainskija pčalary, dla ŭšanavańnia pamiaci svajho vialikaha patrona dumajuć sarhanizavać Daśledčy Pčalarski Instytut im. P. Prakapoviča.

**35 hadoŭ pracy ŭ kooperacyi** končyŭ sioleta viedamy polski hramadzki i kooperatyŭny dziejač ks. V. Biziński. Krakaŭskaja Akademija Navuk z hetaj nahody pryznała jubilatu hrašovuju naharodu ŭ sumie 10.000 zł.

Ks. V. Biziński vielmi zasłužyŭsia dla polskaj kooperacyi ŭ hranicach b. Rasiei: jon z samaha moładu asieŭ u biednaj, apuščanaj vioscy Lisków, i niaŭtomnaj pracaj davioŭ hetu viosku da stanu prykładnaha dabrabytu.

**1 hroš na litr.** Mnoha pišacca i havorycca ciapier ab novaj polskaj haspadarčaj palitycy, jakaja maje byccam namier padniać ceny na roznyja pradukty žyviołahadoŭli. Jak tam budzie z hetaj padvyžkaj dalej — nia viedama. Cikavyja ludzi adnak užo abrachavali, što małako „padyjmiecca" ŭ canie za adzin litr až na 1 hroš: „vialikaja paciecha".

**Naharody dla hadaŭcoŭ koniaŭ.** Ad 25 krasavika da 23 traŭnia (maja) siol. na abšary Vilenskaj Ziemlarobskaj Pałaty (Vilenščyna i Navahradčyna) było sarhanizavana 17 vystavak darosłych koniaŭ i žarabiat-adnahodak. Metaj vystavak było zaachvočvańnie sialan da starannaj hadoŭli koniaŭ i zatrymańnie pašyranaha zabivańnia žarabiat dziela skurak. Ułaśnikam adznačanych koniaŭ i žarabiat razdana było jak naharody 4.155 zł. Treba pry hetym viedać, što pavodle rasparadžeńnia Dyrekcyi Remontu Koniaŭ, naharody poŭnaściu vypłačvajucca tolki tym hadaŭcom, jakija najmienč try miesiacy prad vystaŭkaj byli siabrami miascovych hurtkoŭ (kołaŭ) dziela hadoŭli koniaŭ.

**Niačuvanaje hradabićcie** naviedała ŭ druhoj pałovie lipnia Vaŭkavyski paviet, parabiŭšy asabliva vialikija škody ŭ hminach: Roś, Ciareški i Niścibava (papolsku — Mścibów).

# Сельская гаспадарка.

## Першая работа — падлушчыць аржышча.

Убогая глеба беларускіх зямель вымагае ад нашага гаспадара-земляроба ўмелай і ў час праведзенай падрыхтоўкі яе пад уськія пасевы. Тым больш, што суровы клімат наш вельмі скарочвае пару ўсякіх працаў на ральлі ў полі. А бяз гэтага „наша поле дрэнна родзіць“.

Клімат палепшыць, злагодзіць, чалавек ня можа; але можа ён адпаведна абрабіць глебу і гэтым самым павялічыць ураджай з яе.

Каб добра абрабіць глебу, трэба застасаваць два правілы, якія не вымагаюць ніякіх выдаткаў і таму ўсякаму даступны. Першае правіла — **не пазьніцца;** другое — працу разлажыць так, **каб папярэдняя аблягчала наступную.**

Гаспадарчы год у земляробстве прынята рахаваць ад жніва. Поле па жніве можа астацца нейкі час пад аржышчам толькі ў мокрую пагоду. Як толькі зямля пад аржышчам прачахне (ня лепіцца), яе трэба **зараз-жа мелка** ўзараць, падлушчыць (зябліць). Гэта ёсьць першая і канешная праца пры абрабляньні глебы; асабліва — глебы цяжэйшай.

Нашто гэта робіцца?

Робіцца гэта дзеля таго, каб утрымаць у глебе патрэбную вогкасьць і гэтым самым захаваць гэту глебу ў нязьбітай крупчатай будове (у друбкох). Малое хоць-бы толькі спазьненьне з зябленьнем аржышча бывае ўжо прычынай засушваньня глебы на скарынку, каторая пасьля ніякай снасьцю не даецца дакладна раскрышыць.

Узараныя ськібы аржышча таксама ня можна пакінуць на востра — іх трэба зараз-жа прыбаранаваць. На востра ўзаранае аржышча можна пакінуць незабаранаваным толькі тады, калі зямля вогкавая (вільготная) і мажыцца каля зубоў бараны: трэба тады з баранаваньнем пачакаць, пакуль зямля нагэтулькі прасохне, каб ня мазалася.

Сама падлушчаная плугам і прыбаранаваная ськіба ральлі пры гэтым, праўда, высахне; але яна сабой заслоне (заценіць) глебу і не пазволе, каб з яе выпароўвалася вада, а сама глеба ссыхалася на больш ці менш цьвёрдую скарынку. Ясна, што чым цянейшы пласт зямлі аддасца на гэткае высыханьне, тым лепш. Дзеля гэтага падлушчываць аржышча трэба як толькі можна мягчэй (3 цалі).

Падлушчаньнем зацененае і гэтым самым ад высыханьня абароненае аржышча

## U spravie rachunkavodztva.

Cikavuju spravu zakranała „Samapomač“ letaś i sioleta ŭ m-cy červieni. Maju na dumcy rachunkavodztva. Škoda tolki, što sprava heta niejak musić nie znachodzie šyrejšaha posłuchu, kali ab jej prychodzicca pačuć usiaho adzin raz na hod. Hetak było letaś, a bajusia kab nia stałasia i sioleta. I tamu rašajusia zabrać hołas u hetaj spravie, choć vieru mocna, što jość u nas ludzi, jakija patrapili-b ab hetym pisać lepš. Pakul jany adnak maŭčać, chaču vyskazać svaje dumki ja, haspadar-praktyk, što siedziačy na 6-cihektarovym chutary, piać hod užo viadu haspadarskaje rachunkavodztva i haspadaruju tak, što choć nia maju zbytkaŭ, to adnak nia znaju i biady, jakoj kruhom nas poŭna.

Značeńnie i patrebu rachunkavodztva ŭ haspadarcy ja dakazavać tut nia budu: dobra heta pakazana było ŭ „Samapomačy“. Chaču zaznačyć tut tolki, što, rachujučysia z roŭniem ahulnaj ŭ nas aśviety, uvažaŭ-by za kanieśnaje pačynać rachunkavodztva nia zrazu ŭ adumysłovych knihach, bo heta farmalnaść našaha čałavieka časta pužaje. Naš čałaviek baicca za hetu spravu bracca, bo jamu zdajecca, što da takich knih treba „pisara“, dy što jon sam na heta nia maje ani času, ani advahi.

Vot-ža choć hetkaje razumieńnie spravy i abmyłkovaje, to jaho adnak možna razumieć i z im kanieśna treba rachavacca. Jak-ža tady być?

Nie chaču nikomu nakidać svajho pierakanańnia; chaču tolki raskazać, jak ja „ŭciahnuŭsia“ ŭ rachunkavodztva. Ja nia braŭsia taksama adrazu za adumysnyja buchhalterskija knihi, a pačynaŭ z viadzieńnia zvyčajnych haspadarskich zapisak, u kalendary. A kali tam nie chapała miesca — pieraniośsia ŭ sšytok, spašyty z arkušoŭ čystaj papiery linavanaj u kletku. U hetki kalendar-sšytok ja zapisvaŭ spačatku takija mamenty, jak dzień, u jaki pabiehała karova, śvinia, aviečka i h. d., kali, kolki, dzie i jakoha vysiejena było ziarnia i kolki sabrana, kolki skormlena, pradana, jak i dzie pahnojena. Kolki zaniało času ŭzarańnie, zabaranavańnie i naahuł abrableńnie tej ci inšaj niŭki pola. Taksama padrachoŭvaŭ i zapisvaŭ, kolki času i siły (čałaviek) treba było na toje, kab uradžaj z pola sabrać. Tut-ža zapisvaŭ usie svaje prychody i ŭsie raschody. Z časam u takija-ž zapiski zapisvalisia zaciemki i ab pahodzie, ab časie siaŭby, žniva, kaśby; a paśla—i ŭsie važniejšyja zdareńni ŭ haspadarcy.

Na pačatku ŭsio heta zdajecca niacikavym, nudnym. Asabliva niebiaśpiečnym byva-

заўсяды будзе даваціа дакладна выраблящь пад наступную сяўбу. Наадварот, аржышча, у пару не падлушчанае, з часам гэтак зьбіваецца і высыхае, што яго ня можна ў пару належна вырабіць і таму ўраджаі бываюць у нас, нават на добрых глебах, ніжэй сярэдніх.

Усё вышэй сказанае змушае земляроба стасаваць у вырабляньні глебы гэткі парадак:

Зразу па жніве збожжа, снапы зьвесьці ў адно месца, а аржышча як можна мягчэй падлушчыць (узараць) і прыбаранаваўшы яго або пакінуць вольна стаяць, або засеяць пажніўнымі расьлінамі, аб чым мова ніжэй. Ні ў якім выпадку ня можна пакідаць незааранага аржышча „на пашу": марная гэта паша, коратка яна трывае, а ў дадатку — на неўзараным аржышчы свабодна абходзіць і разьвіваецца высыпанае зерне ўсякага пустазельля (травы), якое не дае адпачынку глебе і высмоктывае яе.

Дзеля таго аржышча трэба адразу падлушчыць.



*Ці Вы ўжо аплацілі падпіску на „САМАПОМАЧ" на II-гое паўгодзьдзе? № конта П.К.О. 180.485.*



# Па жніве — сяўба.

Важная гэта рэч — добра сабраць з поля ўраджай. Але важнейшым мусіць будзе прыгатаваньне ўраджаю на год наступны, бо „што пасееш тое й пажнеш". Аб гэтым трэба памятаць прад кожнай сяўбой, а асабліва прад сяўбой азімага збожжа, якога ў нас высейваецца найбольш.

Першае тут месца займае **жыта**. Удаецца яно ня толькі на добрай глебе, але нават і на вельмі слабай, абы толькі ня была падмоклай. У севазвароце, пры звычайнай трохпалёўцы, жыта найлепш ідзе па папары; пры трохпалёўцы зьлепшанай — па канюшыне і наагул кармовых мешанках (віка, сэрадэля), а так-жа па лубіне. Можа так жа йсьці жыта і само па сабе, але гэта ў выпадку толькі крайняй канешнасьці. Горш даваць жыта па пшаніцы ці ячменю і найгорш — па аўсе.

На колькі непераборлівае жыта ў прыродных свомасьцях глебы, на столькі чуткое яно на спосаб абрабляньня гэтай глебы: ня любіць глебы сьвежа ўзаранай і лішне раздробленай. Таму прад сяўбой жыта трэба даць час, каб поле зьляжалася прынамся тыдзень. Вынятак з гэтага правіла можа быць толькі пры зялёным гнаеньні: прыараўшы лубін ці сэрадэлю трэба сеяць жыта не чакаючы. З тае-ж самае прычыны ня радзяць сеяць жыта ў бульбянішча, бо тут глеба бывае вельмі раздробленай.

je, kali adzin-druhi raschod čałaviek prapuście: tady i chacieŭ-by zapisać, dy ŭžo nia pamiataje. Tut pamahaje tolki ćviordaja pastanova, što ,,viaści rachunki budu—i kaniec!"

Za rabotu takuju najlepš bracca ŭviečary, pa caładziennaj pracy, a taksama ŭ śviata. Z ułasnaha dośledu ćvierdžu, što treba pry hetym siabie na pačatak nałamać, až pakul nia ŭvojdziecca ŭ pryvyčku.

Jak prajšoŭ hod, ja na adnym asobnym arkušy vypisaŭ usio, što mnie dało pole, na druhim — usio što daŭ chleŭ, na trecim — pčoły i h. d. Hetak sama ja abrachavaŭ, kolki vydatkaŭ (u hrašoch i ŭ pracy) mnie kaštavała kožnaja halina pracy. Viedajučy prychody i viedajučy raschody, mnie možna było ŭžo vyrachavać, što ŭ haspadarcy apłačvajecca, a što jaje žjadaje.

Hetki pierahlad haspadarki staŭsia mahčymym tolki dziakujučy haspadarskim zapiskam.

Mianie ŭsio heta vielmi zacikaviła i zaachvociła da dalšaj pracy ŭ hetym-ža kirunku. U mieru taho adnak, jak rasło zdavaleńnie z pracy zroblenaj i zacikaŭleńnie da budučyni, prychodziła i śviedamaść, što dla dakładnaha abličeńnia haspadarki treba adrazu viaści zapiski ŭ naležnym paradku, numarujučy kožny zapis i abaznačajučy jaho asobnaj dataj (dzień, miesiac, hod). Hetkaje viadzieńnie zapisak akazałasia značna lahčejšym, bo adrazu ŭkładaŭsia paradak, a akramia taho z hetkich zapiskaŭ pry kancy hodu było ŭžo značna lahčej zrabić akančalny padrachunak, bo tut kožny zapis mieŭ svajo stałaje miesca i jaho možna było lohka znajści.

Pryjmajučy pad uvahu ŭsio vyšejskaznaje, ja:

1. ščyra i mocna zaachvočvaju kožnaha haspadara pakinuć viaści haspadarku na ślepa i chto tolki ŭmieje siak-tak trymać ałavik u rucce, pačać viaści rachunkavodztva;

2. dla tych, chto baicca, što nie patrapić dać sabie rady z vialikimi buchhalteryjnymi knihami, radžu pačać ad zvyčajnych haspadarskich zapisak. Hetkija zapiski adnak nia možna rabić na asobnych kartačkach papiery — bo pahublajucca — a stała ŭ adnej i tej-ža knizie (kalendary-sšytku);

3. chto ŭciahniecca ŭ viadzieńnie haspadarčych zapisak i zrazumieje ich istotu i vartaść, dla taho ŭžo budzie adzin tolki krok da viadzieńnia sapraŭdnaha rachunkavodztva.

Dyk chto ŭmiaješ trymać u rucce piaro, to pakažy što hetaha piara zasłužyš. Redakcyju ,,Samapomačy" prašu, kab i dalej znajomiła i zaachvočvała našych sialan da rachunkavodztva.

**H. Ihnatovič.**

Жыта мала баіцца ўсякага пустазельля. Але гэта ня знача, каб яго можна было сеяць у ральлю заглушаную пырнікам ці якой іншай сорнай травой. Сьвежага гнаеньня хляўным гноем жыта ня любіць; лепш удаецца на полі ў другой і нават трэцяй гнойнай сіле; асабліва, калі дадаюцца — хто можа— гнаі штучныя. На лёгкіх, бедных на вапну глебах — 200—300 кілё тамасоўкі, а на глебах сільнейшых (гліна) — 150—250 кілё супэрфосфату. Азотныя ўгнаеньні, найлепш 50 кілё чылійскай салетры на 1 ha, даюцца «на ліст“ на вясну, калі жыта толькі што рухне расьці па зімовым адпачынку.

Часу сяўбы жыта раз на заўсяды і для ўсякіх варункаў устанавіць згары ня можна. Агулам толькі можна сказаць, што на лягчэйшых глебах трэба сеяць раней, а на цяжэйшых — пазьней; але ва ўсякім выпадку пазьніцца з сяўбой ня можна.

Агульная абмылка нашых гаспадароўземляробаў у тым, што сеюць за густа. На гэктар, сеючы з рукі, можна даваць жыта ня больш 160—200 кілёграмаў, а з сеялкі — 100—160 кілёграмаў. Пры гусьцейшай сяўбе жыта будзе расьці ў салому, але не на зерне.

Аб падбіраньні і прыгатаваньні сяўбовага насеньня тут гаварыць ня будзем, бо „Самапомач“ аб гэтым сёлета ўжо пісала (№ 7). Правілам толькі быць мусіць, каб сяўба была чыстая, здаровая і ўсходлівая. За чужымі, нязнанымі сартамі сяўбы гнацца ня трэба: найлепшым ёсьць той сорт сяўбы, які на нашым грунце ўжо колькі гадоў беспрарыўна рос і добра ўдаваўся.

**Пшаніца азімая** вымагае глебы значна лепш выробленай і пагноенай, а да таго — чыстай ад травы, глыбокай і не за сухой. На пяскох не ўдаецца. Больш таксама ад жыта вымагае пшаніца і цяпла, а дзеля таго яна часта вымярзае. З гэтай так-жа прычыны трэба пшаніцу раней сеяць.

У севазвароце пшаніца таксама больш ад жыта пераборлівая. Найлепш сеяць пшаніцу пасьля вікавай мешанкі, скормленай як зялёная паша, а так-жа пасьля канюшыны і наагул пасьля матыльковых расьлін і пасьля раньняй бульбы. Калі-б здарылася канешнасьць сеяць пшаніцу пасьля жыта ці ячменю, дык таксама можна; трэба толькі тады глебу сільна пагнаіць штучнымі гнаямі ці нават гноем хляўным. У праціўлежнасьць жыту, пшаніца не баіцца асяданьня ральлі і таму можна яе сеяць на сьвежа ўзараным полі.

Пшаніца патрабуе сільнага гнаеньня. Можа яна карыстаць і з сьвежага гнаеньня хляўным гноем, але лепш любіць гнаі штучныя. У добрыя часы давалася пад пшаніцу прад сяўбой на гэктар 300 кілёграмаў супэрфосфату, а вясной, калі пачнецца сам рост, „на ліст“ — 50 кілёграмаў салетры.

Сеецца пшаніцы на гэктар: з рукі — 180 200 кілё, а сеялкай — 140—180 кілё.

Пшаніца больш чуткая ад жыта на ўсякае пустазельле і наагул на хваробы. Таму на падбор сяўбы пшаніцы трэба зварачваць яшчэ большую ўвагу, чым гэта было ў жыта. Небайцаванага насеньня пшаніцы на ўсякі выпадак ня можна ніколі высейваць. Аб тым, як сяўбавое насеньне байцуецца, глядзі „Самапомач“ № 7—8. 1934 г.

С. Я.



# Zakon ab pieraacency hruntoŭ

Jak užo viedama, 26.III. siol. byŭ pryniaty ŭ Polščy novy zakon, pavodle jakoha buduć canicca hrunty i ŭ našym Krai. Pradbačanaja pieraacenka hruntoŭ, razam z ustanaŭleńniem haspadarčych i klimatyčnych akruhoŭ, źmienić vyšyniu dahetulešniaha padatku ad hruntu. A ŭ hetym naš čałaviek musić być vielmi zacikaŭleny.

Na ŭstanaŭleńnie haspadarčych i klimatyčnych akruhoŭ čałaviek naš nia budzie mieć upływu. Ale jon moža mieć upływ na pieraacenku hruntoŭ i z hetaha musić skarystać. Ab składzie acenačnych kamisij „Samapomač“ užo pisała. Tut tolki dadamo, što acenku pavietavaj acenačnaj kamisii (hetak zvanaj „Komisji klasyfikacyjnaj“) možna abžałavać tolki da kamisii vajavodzkaj. Dalej užo nijakaj žałaby zakon nie pradbačyć. Hetaki paradak pieraacenki zmušaje kožnaha ŭłaśnika hruntu napierad abznajomicca z pastanovami samaha zakonu, kab viedać što možna i čaho nia možna.

Vot-ža sam zakon ab pieraacency hruntoŭ davoli karotki, bo składajecca tolki z 13 paragrafaŭ, z katorych dla ŭłaśnikaŭ hruntoŭ važny pieršyja piać. Rešta dapoŭnić majuć dadatkavyja rasparadžeńni i instrukcyi.

Zakon uvažaje jak *aromy hrunt* nia tolki samaje aromaje pole, ale tak-ža pole pad sadami, aharodami, *štučnymi* paśbiščami i budynkami. Heta znača, što ad ziamli zaniataj budynkami, sadami i h d. treba budzie płacić toj samy padatak, jak i ad pola zasiejenaha žytam. Što da paśbiščaŭ, dyk jany majuć canicca na roŭni z aromym polem tolki tady, kali śviedkami, a chibaž i dokumantami, možna budzie dakazać, što jany byli załožany za ludzkoj pamiaci.

Sienažaci, jakija choć i słužać viasnoj i ŭvosieni za paśbišča, ale zvyčajna skašyvajucca, buduć asenivacca pavodle asobnaj staŭki.

Aromyja hrunty buduć padzieleny na 6 klas: 1-aja—najlepšaja, a 6-ja — najhoršaja. Toje samaje i z sienažaciami. Prydzieł hrun-

# Сеймо пасьляжніўныя мешанкі!

Усюды гаворыцца й пішацца, ня толькі ў фахова-земляробскай прэсе, але й у іншай, аб гадоўлі жывёлы, асабліва малочнай, а таксама і аб тым, што гэткая гадоўля аплачваецца. Асабліва шмат пішацца аб гэтым апошнім часам, калі ўрад скасаваў вывозныя прэміі на збожжа (у 1934 г. ўрад выплаціў каля 94 мільёнаў), а цяпер прызначыў гэтыя грошы на ўспамогу гадоўлі хатняй жывёлы. На кожным кроку чуем: „Пачынайма палепшываць нашу гадаўляную гаспадарку"!

Знаюць нашы сяляне, ды ня раз мелі магчымасьць і пераканацца, што добра ведзеная гадоўля дае йшчэ сякі такі зыск у сялянскай гаспадарцы. Аднак у практыцы гэта справа йдзе вельмі марудна. Прычын кепска ведзенай у нас гадоўлі ёсьць досыць. Затрымаюся над аднэй і то галоўнай, пайменна: над нястачай пашы.

Аб гэтым шмат пішацца. Але нашы сяляне часта і цяпер яшчэ кажуць, што пішыцца, быццам, на тое, каб было напісана, а не на тое, каб яго практычна ў гаспадарцы застасовываць... Але далей гэтак быць ня можа. Абавязкам гаспадароў, асабліва цяпер, ёсьць падумаць над спосабамі прыдбаньня пашы. Маю на думцы пасьляжніўныя мешанкі як зялёную пашу.

Нашы гаспадары павінны ведаць, што добра засееныя пасьляжніўны плод (мешанкі — *рэд.*) мае вялікую вартасьць, бо дае магчымасьць пратрымаць жывёлу праз восень і тым самым заашчадзіць больш пашы на зіму.

На якіх жа глебах можна сеяць пасьляжніўныя плады на зялёную пашу?

Пасьляжніўныя плады можна сеяць толькі на землях ураджайных ды добра ўпраўленых, галоўным чынам на чарназёмах, на вапністых грунтох ды на лёсавых глінках. На пясковых грунтох сеецца пасьляжніўны плод толькі на зялёнае гнаеньне.

Высейваць пасьляжніўны плод трэба як найхутчэй пасьля сабранага з поля збожжа. Нават адзін дзень мае тут вялікі ўплыў на колькасьць ураджаю.

Аржышча пры гэтым заворываецца на 15 см. і заскародзіцца; пасьля высейваецца зерне і ўзноў прыбіваецца лёгка бараной ці нават толькі валачылам.

На добрых землях прыгнойваць ня трэба. Добра аднак зробіць той, хто аржышча зразу крыху зросіць гнойнай жыжкай, зараз прыарэ, прыб'е і пасьля засее.

Мешанкі на зялёную пашу трэба высяваць на тых палях, дзе на вясну мае быць засееныя авёс, або акопніна ці ўзноў мемешанка; ніколі ня можна такія мешанкі сеяць на такіх палёх, каторыя празначаны пад пасеў азімага збожжа.

Да мешанак на зялёную пашу ня можна дадаваць ячмень: ён, праўда, хутка расьце, але сільна выпаражнівае грунт.

Мешанка добрай бывае з вікі, бобіку, з малым дадаткам пялюшкі і польнага гароху. З збожжа добра даць авёс, але ня больш аднэй трацiны ўсей высейванай мешанкі. На гэктар высейваецца 250 кілё. Але не пазьніцца! Чым раней, тым лепей. Гэткая мешанка дае ўраджаю 250 мэтр. цэнтн. зялёнай пашы з аднаго гэктара. Скармліваецца мешанка жывёлай ў сьвежым стане, па 40—50 кілёграмаў на дзень і штуку.

---

toŭ u paasobnyja klasy budzie mieć naŭviecie tolki hrunty siaredniaj kultury i vydajnaści. Dziela hetaha, kali chto svaju ziamlu naležnym abrableńniem i hnajeńniem na stolki palepšyć, što jana budzie davać lepšyja ŭradžai, jak takaja-ž ziamla ŭ susieda, dyk hetki rupny haspadar nia budzie płacić vyšejšaha padatku ad bolšaha ŭradžaju, taksama jak nie darujecca padatak tamu haspadaru, jaki svaju ziamlu spustavaŭ.

Niekarysnaj jość pastanova zakonu ab tym, što hrunty užo zmeliooravanyja mohuć być zaličanyja da klasy vyšejšaj.—Ale zmelioravańnie (prr. asušeńnie) hruntu paśla ŭchodu ŭ siłu zakonu ab pieraacency hruntu nia moža być padstavaj da zapisańnia hetaha hruntu ŭ klasu vyšejšuju.

Da hetaha zakonu buduć vydadzieny jšče instrukcyi, jakija aznačać miascovyja nazovy hruntoŭ, naturalnyja varunki i sposab aceny hetych hruntoŭ. «Naturalnyja varunki» hruntoŭ, heta pahoda, vyška nad moram, a tak-ža pachilenaść (na ŭschod, zachod i h. d.).

Sienažaci ŭ zakonie padzieleny tak-ža na 6 klas i buduć aceńvacca pavodle liku pakosaŭ, kolkaści i jakaści źbiranaha siena. Da 1-šaj klasy sienažaciaŭ naležać tyja, jakija z hektara dajuć 60 q (q=100 kilo) murožnaha ci kaniušynnaha siena; sienažaci 2-hoj klasy pavinny davać z ha 40q (vosiem parakonnych vazoŭ na 5q kožny) siena, sienažaci 3-aj klasy—dvukosnyja, z ha dajuć 25q siena (pa 5q kožny); 4-ja i 5 ja klasy heta ŭžo sienažaci adnakosnyja; 6 ja klasa — adnakosnyja, błahija.

Ahułam uziata acenka aromych hruntoŭ značna lahčejšaja, čym acenka sienažaciaŭ.

5-ty artykuł zakonu napaminaje, što sami ŭłaśniki hruntu buduć mahčy być pryčasnymi ŭ hetaj acency: prad acenačnaj pastanovaj Pavietavaj Acenačnaj Kamisii ułaśniki miecimuć prava padavać vusnyja i piśmiennyja prapanovy. Važnaja heta reč, ale... mahčymaja tolki tam, dzie hetkija prapanovy nia buduć padavacca ŭ rassypnuju, a kanieśna sposabam arhanizavanym.

Da hetaj spravy jšče vierniemsia.

*T. S—ski.*

Гарчыца дае таксама добрую пашу для малочных кароў. Высейваецца яна ў першых днях жніўня, бо яна хутчэй расьце і менш патрабуе часу для свайго розьвітку. На гэктар сеюць яе 24—30 кілёграмаў. Касіць яе на зялёную пашу трэба прад цьветам. Даецца ня больш 25 кілёграмаў на штуку і дзень. Калі даваць гарчыцы больш, дык гэта шкодзіць на якасьць малака. Таму што гарчыца ня можа карыстацца вольным азотам з паветра, як гэта робяць расьліны матыльковыя, — радзяць пагнойваць поле прад пасевам гарчыцы разьведзенай гнойнай жыжкай.

**Інж. Р. Г. („Сіль. Госп.“).**

---

# Жыта як зялёная паша.

Нястача пашы для хатняй жывёлы — гэта хронічная (сталая) хвароба нашых гаспадарак. Найлепшая жывёла гэтак ня толькі не дае ніякай карысьці, але наадварот — сама памалу гібее і марнуецца за нішто раз на заўсяды. Таму ў добрага гаспадара ня пустуе і найменшы хоць-бы кусочак поля.

Усё часьцей сустракаем і ў нас азімыя аржышчы абсееныя ўсякімі мешанкамі. Добра гэта вельмі. Але можа так здарыцца, што на нейкі кусочак поля ня хопе сяўбы. А пустым пакінуць яго ня можна. І ў такім разе можна і трэба яго засеяць хоць-бы звычайным азімым жытам.

Ня трэба на гэта ніякага заводнага жыта. Трэба яго толькі сеяць як можна раней і гусьцей, каб можна было мець адзін пакос яшчэ ўвосені, а другі на вясну. У гэтак засеенае жыта можна ўсейваць па 14 днёх яшчэ зімовую касматую віку або сэрадэлю: вясной па скожаным жыце сэрадэля аста нецца вольна расьці, улетку дасьць адзін пакос, а да восені можа служыць добрым пасьбішчам. Усееная ў жыта віка скошываецца раньняй вясной разам з жытам.

Сеючы жыта на зялёную пашу трэба памятаць, што гэткі пасеў удаецца толькі на добрай зямлі, якую можна нават крышку прыгнаіць хляўным гноем: чаго ня выкарыстае зялёнае жыта, тое астанецца для наступнай расьліны, каторая прыйдзе пасьля жыта. І яшчэ адна рэч: буйна ўзрунеўшае да восені жыта можа за зіму адапрэць. Пагражае пры гэтым надбытак грунтовай і сьнегавой вады. Ад надбытку грунтовай вады баронімся тым, што ральлю прад пасевам узорываем глыбака, каб вада магла вольна прасачывацца ўглыб. Добра таксама зробім, калі для спаду вады па версе прааром укосныя — зьверху ўніз -- барозны. Паказаныя спосабы бароняць і ад лішкаў сьнегавой вады. Сыта ўрунеўшае прад сьнегам жыта трэба ў дадатку скасіць: дае гэта добрую пашу і бароніць ад выправаньня.

**П. З.**

# Лепшае — на плем, горшае на продаж.

Правіла „лепшае на плем, горшае — на продаж“ трэба стасаваць ува ўсей жывёлагадоўлі. Я тут аднак хачу сказаць колькі слоў толькі аб гаспадарскім птушніцтве, бо сучасная пара якраз гэтага вельмі вымагае.

Курыца ў сялянскай гаспадарцы здаецца такой малой і нязначнай, але калі зраўняць тыя клопаты й выдаткі, якіх яна для сябе ад гаспадыні вымагае, з тымі дробнымі але сталымі даходамі, якія прыносіць у хворме яёк, дык гаспадарчая вартасьць ейная пакажацца зусім у новым сьвятле: курыца і сягоньня аплачвае сама сябе з вялікім нават надбыткам. Адзін толькі для гэтага патрэбны варунак — каб курынае стада было не выпадковае, а старанна дабранае. Гэта знача, каб кураняты ці то купляныя, ці тымбольш гадаваныя ў сваей собскай гаспадарцы, заўсяды паходзілі ад курэй добра нясушчых і самі былі добра разьвітыя.

У гаспадарцы так ужо вядзецца, што кураняты на плем купляюцца вельмі рэдка. А калі хто запраўды шукае спосабаў направы гадоўлі сваіх курэй, дык звычайна купляе „заводныя“ яйкі, або проста выбірае куранят, што выйшлі з яёк свае ўласнае гадоўлі. У канцы канцоў аднак ўсякае палепшываньне курынага стада залежыць ад умелага выбару куранят на плем, бо і тыя куранаты, што выйшлі з яёк купленых, ня ўсе бываюць варты гадоўлі. І тут, у гэтым выбары, найчасьцей здараюцца абмылкі, якія пасьля ня можна ўжо ніяк направіць.

Бо і як-жа найчасьцей бывае з гэтым выбарам? А вось як: з гнязда выходзяць ня толькі курачкі, але і пеўнікі, каторыя блізу цалком ідуць на продаж, на мяса. Разам з пеўнікамі аднак вельмі часта, сьведама ці нясьведама, ідуць на продаж пад нож і курачкі. Ня было-б у гэтым вялікай бяды, калі-б выбар курачак на продаж быў такім, якім быць павінен; гэта знача, калі-б на продаж даваліся тыя штукі, якія да гадоўлі ня здатныя. Але ў нас, на жаль, дзеецца наадварот: ідучы ці едучы на рынак гаспадыня ловіць тыя штукі, якія „ўжо вырасьлі“, а меншыя, драбнейшыя, пакідае дома, „каб падрасьлі“; рахуе пры гэтым, што за большыя штукі больш возьме, а знача — быццам чыстае вырахаваньне, чысты зыск.

У запраўднасьці аднак справа гэта выглядае наадварот, бо з тых куранят, якія, выйшаўшы з аднаго гнязда, лепш за іншых растуць, вырасьлі-б найлепшыя куры. Гэтыя кураняты аднак для гадоўлі прападаюць, а гадуюцца тыя, якія з першых ужо дзён паказваюць, што да гадаваньня ня прыгодны. Гэткім „выбарам“ можна за адзін год зьнішчыць найлепшае стада курэй. А гэтага быць не павінна, калі гадоўля курэй мае быць даходнай.

Вот-жа, ў імя добра зразумелага інтарэсу, кожная гаспадыня павінна зараз-жа старанна перагледзіць стада сваіх курэй і ўсё лепшае пакінуць на плем, а слабейшае, недаразьвітае, прадаць на мяса. Ніколі не паступаць наадварот. **В. С—ая.**

# Як даглядаць кураняты ў непагадзь.

Кураняты, а йшчэ больш індзюкі, а нават качаняты і гусяняты вельмі ня любяць мокрага надвор'я (непагадзі), якім сёлета прырода так багата нас абдаравала. Таму трэба старацца аблегчыць цяжкую долю наймяншай нашай гаспадарскай жывёлы і паступаць больш-менш гэтак:

1. У дождж, непагоду і наагул за зімна ня выпускаць куранят на двор. Лепш за ўсё ў такія дні запёрці іх у пуні, ці хляве, насыпаць ім зярнят, попелу, пяску, саломы і няхай сабе там капаюцца.

2. Усюды дзе ходзяць (пасуцца) кураняты на адкрытым месцы і гдзе іх неўспадзеўкі можа захапіць дождж, трэба прыгатаваць самыя простыя хоць бы прыкрыўкі, пад каторыя кураняты ў разе патрэбы маглі-б схавацца ад дажджу. Можа гэта быць якая стрэшка з саломы, бляхі, а то і звычайная ўверх дном перавернутая скрынка, з месцам для вольнага ўходу.

3. Калі-б так сталася, што кураняты ўсё-ж на дажджы змокнуць і ня могуць да начы ўжо на дворы абсохнуць, дык іх ні ў якім выпадку ня можна мокрымі пускаць на курасад: трэба іх перш абсушыць у хаце (ці на кухні) і тады толькі пускаць на курасад.

4. У дажджлівую непагадзь трэба куранят карміць больш сытнай пашай, даваць больш зярнят.

5. Найбольш чуткія на мокрасьць індычаты і іх у такую пару трэба трымаць запёртымі ў суху.

6. Сырую пару непагадзі найхутчэй адчуваюць слабыя з натуры кураняты. Гэткія штукі цяпер як раз пара адзначаць і пры першай магчымасьці прадаваць іх на мяса; на плем іх пакідаць ніколі ня можна.

**В. С—ая.**

# Як зьбірацьгрыбы і што з іх рабіць?

Аб грыбох пісалася ўжо ў „Самапомачы". Але тады была мова толькі аб прыгатаваньні грыбоў на продаж, а знача як рынкавага тавару. Тут скажам колькі слоў аб грыбе і прыгатаваньні яго для хатняга ўжытку.

**Зьбіраньне грыбоў.** Зьбіраючы грыб, трэба памятаць аб тым, каб было што зьбіраць на другі год. Ня можна вясьці грыбной гаспадаркі на спосаб дзікі, рабунковы, паводле прыказкі „пасьля мяне хоць трава не расьці". Дзеля гэтага трэба грыб заўсёды зразаць ножам, а ня можна яго вырываць з каранём. Каб грыб быў трывалкі, яго трэба зразу складаць у вольныя карзінкі ці кошыкі, каб не пацёрліся. З гэтай самай прычыны ня можна складаць зьбіраныя грыбы ў мяшкі. Больш трывалкі таксама грыб сабраны ў сухую пагоду, чымся той-жа грыб сабраны ў пагоду дажджлівую.

Уважным трэба быць пры зьбіраньні, каб не набраць грыбоў атрутных. Але гэтага ня можна навучыцца з кніжкі. Агулам трэба памятаць, што добры грыб — акрамя рыжыка і казьляка (масьляка) — пераламаны ці перарэзаны не мяняе свайго пачаткавага колеру. Спажыўнаю вартасьцю грыбы стаяць паміж мясам і збожжам. Найлепшыя грыбы гэта баравікі.

**Прыгатаваньне грыбоў.** Сабраныя грыбы можна розна прыгатоўваць: смажыць, квасіць, сушыць, або рабіць усякія прыправы.

Сьвежа сабраныя грыбы трэба як найчысьцей перабраць, абчысьціць і апаласкаць. Даўжэй як адну пару (24 гадзіны) неперабраныя і неачышчаныя грыбы трымаць ня можна, бо тады яны трацяць смак. Такія грыбы як сыраежкі трэба абабраць. Рыжыкі і смаршчкі трэба заліць гарачай вадой.

Ня можна забывацца на тую асаблівасьць грыбоў, што іх хоць ня можна есьці недаваранымі,сыраватымі,то таксама ня можна і пераварываць, бо тады яны становяцца менш страўнымі. Перад самым гатаваньнем трэба грыбы апаласкаць у летняй вадзе. Пры самым гатаваньні грыбоў ня можна даліваць вады.

Тушыць грыбы трэба гэтак: сьвежасабраныя, ачышчаныя, выпаласканыя і парэзаныя на дробна грыбы заліваюцца колькі разоў вараткам. Тады бярэцца цэлапаліваны (можна і пабяляны) гаршчок, на дно кладзецца тлушч, пасьля крышыцца цыбуля, на яе засыпаюцца дробна пакрышаныя грыбы і тушацца прыкрытыя на вольным агні. Калі грыбы зьмякнуць, іх трэба пасаліпь, дадаць крыху перцу. Калі ёсьць — добра тут будзе дадаць квасная сьмятаны, а таксама лыжку мукі.

**Грыбная зупа.** Вычышчаныя і пакрышаныя грыбы заліць сьцюдзёнай вадой, улажыць колькі цэлых цыбуль і варыць так доўга, аж покуль грыбы разьмякнуць. Далей, прыгатаўляецца засмажка з масла, падмешваецца мукой, разбаўляецца вадой і заліваецца ў зупу, соліцца і беліцца кваснай сьмятанай.

**Квашэньне рыжыкаў** (і зялёнак). Ачышчаныя і выцертыя грыбы складаюцца ў гліняны гаршчок; перасыпаюцца пры гэтым сольлю. Прыціскаюцца дэнкамі і камянём і стаўляюцца ў сухім месцы. Калі мала пускаюць з сябе соку, трэба заліць 1—2 шклянкі гатаванай вады.

Аб сушэньні грыбоў глядзі „Самапомач" №5-6-1933 г. і 6, 7-8-1934 г. **В. Ш.**

Ф. Акінчыц

*У парадку дыскусіі.*

# Аграрна - коопэратыўная палітыка будучыні. 4)

### 3. Агульны кантроль дзяржавы за дзейнасьцю коопэратыўных аб'яднаньняў.

Маючы на ўвазе тыя паважныя заданьні, каторыя ўстануць перад коопэрацыяю ў «дзяржаве будучыні» — гэтая апошняя ня зможа роўнадушна ўстасункавацца да таго, у якім кірунку пойдзе коопэратыўнае будаўніцтва ў аграрнай галіне. Коопэрацыя,ператварыўшыся ў рэконструкцыйную сілу — павінна ўвесьці і замацаваць на вёсцы арцельныя суадносіны, імкнучыся да зьністажэньня там соцыяльна-эканамічнай няроўнасьці і ўзмацненьня гаспадарчага поступу ўсяго сялянскага агулу. Іншага стану рэчаў прызнаць мы ня можам і таму не залічаем да ідэалу, напрыклад, сучасны стан данскай коопэрацыі, трымаючай «курс» на ўдасканаленьне індывідуальных сялянскіх гаспадарак, пераважна замажнейшых, шляхам выкарыстаньня ўсіх гаспадарчых плюсоў, каторыя дае коопэратыўная форма аб'яднаньня.

Аграрна-коопэратыўная палітыка дзяржавы павінна быць пабудавана так, каб тварыліся такія коопэратыўныя аб'яднаньні, каторыя запраўды імкнуцца да перабудовы і каторыя дакладна ўяўлялі-б сабе тое галоўнае, да чым палягае сутнасьць коопэратыўнага руху, пачынальнікі якога імкнуліся да перабудовы ўсяго эканамічнага і грамадзкага ладу на колектывістычных падставах. Наўперад, павінна быць зьвернена ўвага на зьбіраньне коопэратывамі розных фондаў, неабходных для ўдасканаленьня і пашырэньня прадпрыемства. У свой час яшчэ Фур'е вучыў, што прынамсі $1/5$ частка чыстага даходу калектыву павінна йсьці ў непадзельны запасны фонд, а прапаведнік вытворчых коопэратываў Бюшэ (Buchez) зусім слушна казаў, што толькі пры пастаянным павялічваньні непадзельнай часткі коопэтатыўнага капіталу — вытворчы коопэратыў можа перамагчы эгоістычныя інтарэсы паасобных сяброў і тады ўся арганізацыя будзе мець вялікшую эканамічную моц.

Дзе гэтай справе не ўдзяляецца адпаведнай увагі, там і інтарэсы суцэльнасьці, інтарэсы самой грамадзкай арганізацыі, адыходзяць на задні плян і ў канцы канцоў яна або траціць свой коопэратыўны характар, або наагул развальваецца.

У сувязі з гэтым увага як дзяржавы, так і кіраўніцтва коопэрацыі павінна быць зьвернена на тое, каб роўналегла да росту коопэратыўнага будаўніцтва павялічваўся і коопэтарыўны капітал у тэй меры, якая акажацца неабходнаю для „паглыбленьня" коопэратыўнага руху ў сувязі з яго заданьнямі. Трудна, бязумоўна, устанавіць наперад, як гэта робяць Бюшэ і Фур'е, разьмер працэнтнага адлічэньня ў грамадзкі капітал. У кожным выпадку гэткае адлічэньне павінна быць такім, каб магло запраўды павялічваць коопэратыўны капітал.

Наагул, трэба імкнуцца да таго, каб у гэты капітал адкладалася па магчымасьці вялікшая частка прыбылі, а астатак яе павінен быць такім, каб пасьля яго падзелу паміж удзельнікамі коопэратыву, ён уяўляў для іх пэўную гаспадарчую вартасьць, з-за якой быў-бы сэнс трымацца коопэратыўнага аб'яднаньня.

Узяўшы ўсё гэта пад увагу, немагчыма раз на заўсёды ўсталіць гэтыя нормы, бо яны павінны мяняцца ў залежнасьці ад розных абставінаў.

Трэба заўважыць аднак, што ўстанаўленьне працэнту адкладу ў грамадзкі капітал мае йшчэ аграмаднае выхаваўча-грамадзкае значэньне і таму на яго мусіць быць зьвернена асаблівая ўвага дзяржаўных органаў.

Пры пляновым і масавым коопэраваньні вёскі мы натыкаем значныя труднасьці наўперад з боку вясковай беднаты, каторая будзе адставаць у коопэратыўным будаўніцтве і таму на яе прыйдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу. У капіталістычных дзяржавах да сёньняшняга дня наглядаецца слабая зацікаўленасьць да коопэрацыі з боку бяднейшай часткі сялянства, якое ня верыць, што пры дапамозе аднэй толькі коопэрацыі магчыма наагул палепшыць сваё матар'яльнае палажэньне. Фактычна, толькі замажнейшая частка насельніцтва мае гаспадарчае выраханьне для ўваходу ў коопэратывы; беднаце-ж, у аграмаднай большасьці выпадкаў, коопэрацыя нічым дапамагчы ня можа.

Для карлаватых гаспадарак, ня маючых жывога і мёртвага інвэнтара і пры і ншых ад'ёмных баках сучаснага стану рэчаў — ніякая коопэрацыя цуду ня зробіць, бо тут патрэбна перад усім радыкальная перабудова ўсяго ўкладу гаспадарчага жыцьця і толькі пасьля гэтага магчыма прыступіць да ўдачнага коопэратыўнага будаўніцтва.

Часта аднак пры спрыяючых нават для коопэрацыі палітычных і грамадзкіх абставінах, можна спаткацца з адставаньнем беднаты ў справе коопэратыўнага будаўніцтва, што, напрыклад, наглядалася ў Саветах, і з чым там вялася барацьба.

Паводле статыстычных дадзеных савецкага коопэратара Цэлляріуса, відаць, што па ўсяму СССР бедната ў коопэратыўным бу-

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ
Z upavažnieńnia Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Vilni.
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—2.

даўніцтве апынулася на апошнім месцы, а на першым месцы стаяць гаспадаркі больш заможнейшых сялян. Гэткае зьявішча бачым ва ўсіх галінах савецкай гаспадаркі Савецкіх рэспублік, з чым мусіў згадзіцца і сам Цэлларіус, каторы кажа, што лепей коопэруюцца больш заможныя групы; сярод коопэраваных гаспадарак яны прадстаўлены лепей ад усіх іншых сялянскіх гаспадарак... Асабліва вялікі ўдзел заможных групаў у некаторых відах спэцыяльнай коопэрацыі“ (Цэлларіус: „Как партия осуществляет кооперативный план Ленина“, бач. 36). Гэта мае і для нас першараднае значэньне, бо і мы таксама спаткаемся з гэтым на практыцы.

Калі-б наагул немагчыма было спыніць адставаньня бедняцкай гаспадаркі ў коопэраваньні, то ў канцы гэта прывяло б да рэзультатаў адваротных тым, каторыя мы маем прыступаючы да рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на арцельна-коопэратыўных падставах. Можа вытварыцца моцная кляса вясковых багацеяў, каторыя ў пэўны мамэнт будуць устрымліваць социяльна-эканамічны поступ, пасколькі ён акажацца ім нявыгадны. Каб да гэтага не дайшло, трэба найвялікшую ўвагу зьвярнуць на коопэраваньне беднаты. З другога боку трэба ўзмоцніць зьбіраньне непадзельнага коопэратыўнага капіталу, коштам зьмяншэньня фонду, падлягаючага падзелу паміж сяброў коопэратыву.

(д. б)

## Наша пошта.

Яз. Ярм—іч, У. Мірук, інж. Д-с, а П—ка— атрымалі, дзякуем, часапіс рэгулярна пасылаем.

С. В—ка, Б. Б—скі і М Сар—іч — пробныя нумары высланы. Дальшыя — па атрыманьні падпіскі, якую з кожнай пошты найлепш выслаць праз П.К.О. (№ конта 180.485, уласьнік конта інж. Клімовіч), або гэтак званым разрахунковым пераказам: нумар нашай картотэкі 40.

М. Норык: што Вы думаеце рабіць з пачатай справай хамута для каровы? Ўдаецца будзе магчымасьць дастаць яго па танейшай цане.

Я. Мат—ак — прысланае атрымалі, дзякуем. А ўсё-ж прынамся поўдзесятка вы хіба маглі-б сабраць. Падумайце!— У справе праўнічай парады для Вас самога, дапоўніце Ваша апісаньне адказамі на гэтыя два пытаньні:

1. Чыя сястра жыве на зямлі Ваша, цётчына ці цётчынага бацькі і ад як даўна?

2. Ці Вы карысталіся з гэтай зямлі і калі (як доўга)?

1. Мат-чыха: Калі 7-ая частка, з якой Вы карыстаецеся, выдзелена, дык дачка самапраўна ня можа яе ад Вас адабраць. А калі-б гэта хацела зрабіць і не давала араць папару, дык у працягу аднаго месяца ад дня самапраўнага нарушэньня дачкой Вашага права, трэба падаць у суд жалабу „o przywrócenie zakłóconego posiadania.“—Гэтага як першага адказу не зьмясьцілі мы ў ліпнёвым нумары „Самапомачы,“ бо спозьнілася Ваша пісьмо.

З. К—ка: „Ziemlarobskuju čytanku“ можам Вам выслаць, калі прышлеце 1 зл. У кніжцы знойдзеце адказы на цікавячыя Вас пытаньні.



**U Niaśvižy:**

| | |
|---|---|
| Žyta | 8.50 - 9.00 |
| Jačmień | 11.50 |
| Avios | —12.00 |
| Siena | 6.00— 7.20 |
| Švini (za kilo žyv. v.) | 0 55 - 0.58 |
| Masła za kilo | 1.50— 1.80 |

**U Słonimie:**

| | |
|---|---|
| Žyta | 9 00 – 1.00 |
| Pšanica | 13 00 –13.50 |
| Jačmień | 10 80—11 50 |
| Avios | 12 00 –14.00 |
| Bulba | 2.40 |
| Kaniušyna (siena) | 4.00— 4 80 |
| Bydła na miasa za kilo žyvoj v. | 0.20— 0.30 |
| Švini | 0.35 – 0.45 |
| Masła za kilo | 1.60 |
| Jajki za štuku | 3 – 5 hr. |

*Pierasyłka apłačanu ryčałtam.*



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ